Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
_____________ В.Р. Языковіч
«19» ________ 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-106/ Э вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі*
*1-23 80 02Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*Прафілізацыя: Культурная спадчына і музеялогія*

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны рэг. № Е23-2-002/ пр-тып. ад 21.03.2019


**СКЛАДАЛЬНІКІ**

**І.Г. Лупашка,** ст.выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі;

**А.М.Нароўская**, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат гістарычных навук, дацэнт


**РЭЦЭНЗЕНТЫ**

**А.А. Іназемцава**, намеснік дырэктара па творчай дзейнасці ўстановы культуры "Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь", кандыдат мастацтвазнаўства;

**С.А. Пацыенка**, дацэнт кафедры менеджмента сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 12 ад 31.05. 2019 г.);
Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 5 ад 12 чэрвеня 2019 г.).


Адказны за рэдакцыю:
Адказны за выпуск: І.Г.Лупашка


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Актуальныя пытанні музейнай справы» садзейнічае павышэнню тэарэтычныга ўзроўню магістрантаў, знаёміць іх з асноўнымі канцэпцыямі, і практычнымі праблемамі музеязнаўства.

*Мэтай* выкладання вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца вывучэнне магістрантамі тэарэтычных аспектаў музеязнаўства, новых тэндэнцый у развіцці музеяў у другой палове ХХ – пачатку ХХI ст., інавацыйных форм навукова-фондавай, навукова-экспазіцыйнай дзейнасці, сучасных форм у галіне культурна-адукацыйнай работы музеяў.

*Задача* вучбнай дысцыпліны «Актуальныя пытанні музейнай справы» – стымуляваць інтарэс магістрантаў да музеялогіі, таму яна арыентавана на найбольш спрэчныя пытанні, якія актыўна абмяркоўваюцца тэарэтыкамі і практыкамі музейнай справы. Праграма вучэбнай дысцыпліны ўключае аналіз такіх праблем, як феномен дамузейнага збіральніцтва, асобна разглядае музей як культурную форму, тэарэтычныя аспекты вывучэння музеяў-запаведнікаў, аналізуе пытанні тыпалогіі музеяў пад адкрытым небам.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Актуальныя пытанні музейнай справы» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны:

Вучэбныя кампетэнцыі:

- ВК-3. Быць здольным выяўляць і аналізаваць актуальныя праблемы, якія вызначаюць канкрэтныя сферы прафесійнай дзейнасці, бачыць іх узаемасувязь, прапаноўваць аптымальныя шляхі для іх вырашэння.

Вучэбна-прафесійныя кампетэнцыі:

- ВПК-2. Валодаць уменнем выяўляць, дыягнасціраваць і ранжыраваць актуальныя праблемы ў галіне музейнай справы, распрацоўваць практычныя рэкамендацыіі па іх аптымальным вырашэнні;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- ВПК-5. Умець вырашаць прафесійныя задачы на падставе сістмнага ўяўлення аб асноўных тэорыях, канцэпцыях і падыходах у сферы музейнай справы і аховы культурнай спадчыны.

Пасля вывучэння дысцыпліны магістранты павінны *ведаць:*

- асноўныя праблемы сучаснай музеялогіі;
- найноўшыя дасягненні і тэндэнцыі ў галіне музеязнаўства;
- канцэптуальныя асновы сучаснай культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў;
- новыя тэхналогіі навукова-фондавай, навукова-экспазіцыйнай работы;

*умець:*

- аналізаваць і выкарыстоўваць тэарэтычныя палажэнні музеязнаўства;
- арыентавацца ў навуковых даследаваннях па праблемах міжкультурных камунікацый;
- вызначаць функцыі музея як сацыяльнага інстытута;
- прымяняць на практыцы навуковыя дасягненні музеязнаўства;
- даследаваць магчымасці развіцця музея XXI ст. ва ўмовах глабалізацыі культуры і ролі новых тэхналогій.

Для больш глыбокага засваення матэрыялу, акрамя аўдыторных заняткаў, у якасці самастойнай работы прадугледжваецца наведванне магістрантамі музеяў, выстаў, прагляд і аналіз мультымедыйных матэрыялаў.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Актуальныя пытанні музейнай справы» выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп’ютарныя тэхналогіі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Актуальныя пытанні музейнай справы” усяго адведзена 108 гадзін, з якіх 36 – аўдыторныя заняткі; лекцыі – 20 гадзін, семінары – 16 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны*

Мэта, задачы і змест вучэбнай дысцыпліны «Актуальныя пытанні музейнай справы». Асноўныя паняцці «музеялогія», «музеязнаўства». Пераасэнсаванне фундаментальных музеязнаўчых паняццяў. Праблемы музеялогіі ў тэрміналагічным аспекце. Змены ў поглядах замежных музеязнаўцаў на вызначэнне музеялогіі.

Музеялогія як навука, якая знаходзіцца на стадыі фарміравання. Адсутнасць агульнай канцэпцыі музея і як вынік – метадалагічнай высновы. Інстытуцыянальны падыход (музеі як навукова-даследчая, культурна-адукацыйная, адукацыйна-выхаваўчая ці рэкрэацыйная ўстанова).

*Тэма 1 Тэарэтычныя праблемы музеялогіі ў канцы XIX- п. п. XX ст.*

Артыкул доктара Й.Г. Грэсэ «Музеялогія як навука» (Дрэздэн, 1883). Музеялогія як новая навуковая дысцыпліна. Публікацыі XIX-XX стст. аб тэарэтычных палажэннях музея. Даследаванні амерыканскага вучонага В. Бернса, тэарэтыка Усходняй Еўропы І. Неуступнага. Міжнародныя канферэнцыі і дыскусіі 1960-1980-х гг. па пытаннях прызнання музеялогіі самастойнай навуковай дысцыплінай.

Унёсак у структураванне музеязнаўства як навукі і распрацоўка асноўных паняццяў даследчыкаў з СССР і шэрагу ўсходніх еўрапейскіх краін (І. Бенеш, Г.Грэгарава (ЧССР), В. Хербст, І. Авэ, К. Шрайнер (ГДР), В. Глузіньскі, З. Жыгульскі (ПНР) і інш.). Тэарэтычныя даследаванні (Э. Александзер (ЗША), Ю. Ромедзер (ФРГ), В. Софка (Швецыя), Дж. Льюіс (Англія). Аналіз узаемадзеяння музея і грамадства, ролі музея ў сучасным свеце К. Хадсана.

*Тэма 2 Тэарэтычнае асэнсаванне праблем музеязнаўства ў другой палове XX – пачатку XXI ст.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Публікацыі па методыцы і практыцы работы з музейнымі алекцыямі: структура музейных фондаў, прынцыпы камплектавання, вывучэння, атрыбуцыі калекцый, методыка ўліку і захавання фондаў. Методыка вывучэння і навуковага апісання разнастайных тыпаў музейных прадметаў у працах У.М. Фаміна, І.М. Суслава, М.М. Левінсон-Нячаевай, Л.М. Ганчаровай, Э.А. Паўлючэнкі і інш. Аналіз фондаў як сістэмы, праблемы абгрунтавання іх структуры ў працах Н.П. Фінягінай ,У.М. Фаміна.

Асноўныя прынцыпы пабудовы экспазіцый, іх структура, навуковае і мастацка-архітэктурнае праектаванне, методыка і прынцыпы фарміравання экспазіцыйных комплексаў у працах А.Б. Закса, А.І. Міхайлоўскай, А.М. Эфроса, А.С. Соусціна, М.Т. Майстроўскай, Ж. Ралена, Т. Дафі, У.М. Палякова, М.Б. Гнядоўскага, Ж. Ландры, Ж.- П. Наталі і інш. Інфармацыйныя выданні па кірунках і тэарэтычных праблемах музейнай справы: Расійская музейная энцыклапедыя (2001). Агляд літаратуры па музеялогіі і музейнай справе па агульнатэарэтычных праблемах.

Літаратура па пытаннях экспазіцыйнай, навукова-даследчай і фондавай рабоце музеяў. Выданні вучэбнага характару па музеялогіі і музейнай справе Т.Ю. Юрэневай, Л.М. Шляхцінай, Э.А. Шулепавай, С.І. Сотнікавай і інш.

Агляд артыкулаў у зборніках «Музейная экспозиция. На пути к музею XXI века" (1997), «Музей и новые технологии. На пути к музею XXI века» (1999), «Теория и практика музейного дела в России на рубеже XX-XXI веков» (2001) і інш.

### *Тэма 3 Навуковыя даследаванні па праблемах міжкультурных камунікацый*

Месца музеяў у міжкультурных камунікацыях у працах М.Т. Бяляўскай, М.І. Рашэтнікава, Э.А. Паўлючэнкі, К. Банэгі, Т.Х. Хансэна, Д.Жамо і інш. Музейна-педагагічныя праграмы. Гульні для школьнікаў, студыі і майстэрні. Распрацоўкі для розных катэгорый наведвальнікаў. Тэарэтычныя даследаванні аб новых рэальнасцях музейнай практыкі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковыя даследаванні, прысвечаныя канкрэтным музейным прадметам, калекцыям. Работы, прысвечаныя абгрунтаванню спецыфікі музейных навуковых даследаванняў, вызначэнню прадмета даследаванняў музеялогіі і функцый музея як сацыяльнага інстытута. Публікацыі А.М. Разгона ,А.Б. Закса, І. Неуступнага, А.М. Эфроса, У.Ю. Дукельскага, А.І. Фралова, Т.У. Станюковіч і інш.

*Тэма 4 Інтэграцыя музея. Тэорыя музейнай камунікацыі*

Першыя навуковыя даследаванні камунікацыйных працэсаў (Р. Хартлі). Гуманітарны і дакладны падыходы да вывучэння спецыфікі камунікацыйных працэсаў. Праблемы сувязі культуры з разнастайнымі тыпамі камунікацыі ў працах К. Леві-Строса. Тэарэтычныя даследаванні праблем камунікацыі М.С. Кагана, Р. Якабсана, Ж.Фажэ, В. Шрама і інш. Тэорыя музейнай камунікацыі канадскага навукоўца Д. Камерона. Канцэпцыя “музея-форума” Д. Камерона. Публікацыі французскага музеолага Ж.-А. Рыўера па тэарэтычным абгрунтаванні экамузеялогіі. Новы самастойны напрамак “Новая музеялогія”. Інтэграцыя музея ў навакольнае аяроддзе і сацыялізацыя.

*Тэма 5 Новыя тэндэнцыі ў развіцці музеяў*
*у другой палове XX - пачатку XXI ст.*

Інавацыі ў музейнай справе ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Культурна-адукацыйныя цэнтры і іх асноўныя задачы. Нацыянальны цэнтр мастацтваў і культуры імя Жоржа Пампіду. Нетрадыцыйныя праграмы культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў. З’яўленне спецыяльных музейных структур. Навучэнне персаналу для культурна-адукацыйнай работы з наведвальнікамі. Аўтары новых музейных канцэпцый. Матывы ўтварэння спецыялізаваных музеяў. Новы тып перасоўных выстаў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Дзіцячыя музеі. Экспазіцыйная і адукацыйная работа ў дзіцячых музеях. Дзіцячы музей у Халоне (Ізраіль). Дзіцячы музей у Полацку. Перспектывы развіцця дзіцячых музеяў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Экамузеі як новы тып музейнай установы. Захаванне гістарычнага асяроддзя: архітэктурных помнікаў, ансамбляў, фрагментаў культурна-гістарычнага асяроддзя. Канцэпцыя інтэграваных музеяў.

*Тэма 6 Музей як культурная форма*

Паняцце "культурная форма" і яго метадалагічнае значэнне. Гісторыя культуры як аб'ект даследавання. Плюралістычны падыход да культурна-гістарычнага аналізу і тэарэтыка-канцэптуальнай трактоўкі феноменаў культуры. Музей як феномен культуры.

Разнастайнасць гістарычных і існуючых форм музейных установаў. Этапы іх эвалюцыі. Аналіз і роля музеяў у культурным жыцці грамадства на этапах яго развіцця. Праблемы музеялогіі як адно з актуальных кірункаў культуралагічных даследаванняў. Лакальныя культуры і глабальны культурны ўніверсалізм. Захаванне самабытнасці культур. Сувязь артэфакта з культурай як цэласнай з'явай.

*Тэма 7 Асноўныя тэндэнцыі фарміравання экспазіцый мастацкіх музеяў XX – пачатку XXI ст.*

Новая музейная канцэпцыя. Музейная арганізацыя "Museum Association" і яе роля. Вызначэнне асноўнай мэты музея. "Навуковая калекцыя" і "дэманстрацыйная калекцыя". Новыя падыходы да разумення сутнасці і задач экспазіцый мастацкага музея. Эстэтызацыя мастацтва ў мастацкіх музеях першай трэці – сярэдзіны XX ст. Эстэтычныя тэорыі. Канцэпцыі П. Валеры, А. Бара, А. Эліота. Экспанат у фокусе. Асноўныя фактары эфектыўнасці экспазіцыі. Канцэпцыя экспанавання: "праблемная групіроўка". Новы кірунак у 1930-40-х гг. у колеразнаўстве. Тэорыя Ф. Бірэна "дынамічнага ці фіксуючага колеру" і "аптымальных колераў" ці "зялёнага колеру". Тэорыі нямецкіх вучоных Г. Фрылінга і К. Ауэра "колеры з высокай здольнасцю адлюстравання". Каэфіцыент адлюстравання ў каларыстычным рашэнні экспазіцый. Класіфікатар колеру.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэалізацыя канцэпцыі “экспанат у фокусе” у 1950-90-я гг. Прынцып музейнай экспазіцыі “Белы Куб”.

Праблема колеру і асвятлення ў экспазіцыях XXI ст. Інавацыі ў сістэме асвятлення. Музей сучаснага мастацтва (Нью-Ёрк). Выстава “Шэдэўры ў турнэ па свеце” (Кунст-хале, Франкфурт-на Майне). Тэхнічнае абсталяванне сучасных музеяў.

*Тэма 8 Асноўныя тэндэнцыі ў сучаснай музейнай архітэктуры і яе ўплыў на структуру музейнай экспазіцыі*

Асноўныя тэндэнцыі ў музейнай архітэктуры другой паловы ХХ – пачатку XXI ст. Будынкі музеяў С. Гугенхайма ў Нью-Ёрку, Венецыі, Берліне. Будынак Музея Гугенхайма ў Більбао (Ф. Геры) і Геці-цэнтра ў Лос-Анджэлесе (Р. Маер, 1997), Гугенхайм Соха (А. Ісадзакі, 1992).

Музейныя будынкі: Гугенхайм Лас Вегас (Р. Коалхас, 2001). Будынкі Kunsthaus Graz П.Кука і К. Фур’е (2003); Цэнтр сучаснага мастацтва (З. Хадзід, 2007). Праекты ў Абу-Дабі і Вільнюсе (2006-2008). Перспектывы развіцця музейнай архітэктуры ў Еўропе і ЗША.

*Тэма 9 Інфармацыйнае забеспячэнне музейнай экспазіцыі на сучасным этапе*

Аўдыявізуальныя сродкі як перадумовы з’яўлення інфармацыйных тэхналогій у экспазіцыі. Гісторыя развіцця інфармацыйнай падтрымкі экспазіцый і часовых выстаў. Суадносіны традыцыйгых музейных экспанатаў і інфармацыйных прадуктаў у межах экспазіцыі.

Тэхнічнае абсталяванне як форма паказу розных відаў музейных пасрэднікаў (чарцяжоў, фотаздымкаў, мультымедыйных пасрэднікаў і г.д.). Інфармацыйна-камунікатыўная мадэль музейнай экспазіцыі. Патэнцыял музея ў інфармацыйным грамадстве.

Метадалагічныя прынцыпы выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у музейным праектаванні. Методыка стварэння і ўкаранення інфармацыйных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхналогій у музейным праектаванні. Методыка стварэння і ўкаранення інфармацыйных тэхналогій у музейнай экспазіцыі. Роля інфармацыйных тэхналогій у музеі ў святле вучэння Э. Тофлера. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў сістэме экспазіцыі музея. Роля інфармацыйных рэсурсаў у музейным праектаванні.

*Тэма 10 Канцэпцыя сучаснай культурна-адукацыйнай дзейнасці музея*

Асноўныя навуковыя парадыгмы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Асаблівасці станаўлення і функцыянавання навуковых школ па тэорыі і практыцы арганізацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці. Пытанні сучаснай метадалогіі і гісторыі культурна-адукацыйнай дзейнасці як сукупнасці тэарэтычных палажэнняў, канцэпцый, метадаў на базе інтэграцыі філасофска-культуралагічных, педагагічных і іншых гуманітарных дысцыплін.

Структура, змест, формы і метады сучасных культурна-адукацыйных тэхналогій. Прынцыпы і метады тыпалагічнага аналізу. Метады навуковага даследавання праблемнага поля соцыуму. Характарыстыка базавых тэхналагічных сістэм культурна-адукацыйнай дзейнасці. Роля параўнальна-гістарычнага, тыпалагічнага, структурнага і сістэмнага метадаў у вывучэнні сучасных тэхналогій культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў.

*Тэма 11 Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў на сучасным этапе*

Музей як культурны інстытут на сучасным этапе. Культурна-адукацыйная дзейнасць як важны элемент музейнай камунікацыі. Культурна-адукацыйная дзейнасць і праблемы сучаснай музейнай прасторы. Традыцыйныя формы і навацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў. Тыпалогія сучасных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці мастацкага музея. Роля новых тэхналогій у культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.

Класіфікацыя культурна-адукацыйных форм В. Бацяковай, М. Юхневіча. Асноўныя характарыстыкі класіфікацыі: клас элементарных форм

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і яго тыпы. Характарыстыка класа комплексных форм. Характарыстыка культурна-адукацыйнай дзейнасці мастацкіх і гістарычных музеяў. Музейная праграма Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь "Археалагічнае падарожжа ў часе і прасторы (першабытная эпоха на Беларусі)". Музейныя праграмы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Асаблівасці культурна-адукацыйнай дзейнасці этнаграфічнага музея. Класіфікацыя форм культурна-адукацыйнай дзейнасці этнаграфічнага музея і сучасныя музейна-педагагічныя навацыі. Вядучыя кірункі, формы і метады культурна-адукацыйнай дзейнасці этнаграфічнага музея.

Асаблівасці культурна-адукацыйнай дзейнасці літаратурнага музея. Музейныя праграмы літаратурных музеяў Беларусі.

Эфектыўныя і перспектыўныя кірункі культурна-адукацыйнай дзейнасці.

*Тэма 12 Асноўныя праблемы тыпалогіі музеяў і іх характарыстыка*

Праблема тыпалагічнага абагульнення пры правядзенні класіфікацыі музеяў. Розніца паміж класіфікацыяй і тыпалагізацыяй. Тыпалагічныя абагульненні як важнейшы сродак гістарычнага аналізу.

Тыпалогія музеяў па Ф.І. Шміту: навуковыя, вучэбныя і публічныя музеі і іх характарыстыкі. Асноўны крытэрый тыпалогіі А.М. Разгона. Тыпы музеяў: асветніцкі (масавы), даследчы, акадэмічны, вучэбны. Тыпалогія музеяў у працах Д.А. Равіковіч. Першы ўзровень тыпалогіі: калекцыйныя і ансамблевыя музеі. Характарыстыка другога ўзроўню тыпалогіі: мастацкія і гістарычныя музеі; музеі экскурсійна-турыстычнага тыпу; музеі ваенна-гістарычныя; краязнаўчыя музеі; музеі – культурныя цэнтры. Праблемы тыпалогіі другога ўзроўню.

*Тэма 13 Тэарэтычныя аспекты вывучэння музеяў-запаведнікаў*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Новая музеялогія і экамузеялогія як метадалагічная аснова развіцця музеяў-запаведнікаў і музеяў пад адкрытым небам. Трактоўка музея пад адкрытым небам у вузкім і шырокім сэнсе. Паралелізм тэрмінаў і яго прычыны. Суадносіны тэрмінаў "музей пад адкрытым небам", "скансэн" ,"экамузей" з паняццямі "этнапарк", "нацыянальны парк". Інтэрпрэтацыя дадзеных паняццяў у сучасным музеязнаўстве. Пашыранае тлумачэнне паняцця музея пад адкрытым небам у фармуліроўцы ІКАМ.

Праблема класіфікацыі музеяў-запаведнікаў. Шматграннасць падыходаў да рашэння дадзенай праблемы. Абмежаванасць класіфікацыі ІКАМ (1982). Вылучэнне чатырох катэгорый музеяў пад адкрытым небам: этнаграфічныя, гістарычныя, экалагічныя і археалагічныя. Тыпалагічная класіфікацыя помнікаў архітэктуры А. Самсонавай. Выдзяленне крытэрыяў адбору помнікаў.

Працэсы трансфармацыі музеяў-запаведнікаў у "жывыя", "інтэграваныя" музеі. Тэарэтыка-метадалагічная аснова змен у музейным будаўніцтве.

Экамузеі як нацыянальна-культурныя цэнтры па захаванні, вывучэнні і выкарыстанні гістарычных аб'ектаў у асяроддзі бытавання. Метады і этапы стварэння экамузеяў. Вопыт дзейнасці экамузеяў у Еўропе і Расіі. Экамузеі Францыі ("Экамузей д'Уасан", "Экамузей дэ Мон д'Ар'е", "Экамузей дэ Сен-Дэган").

*Тэма 14 Праблемы музеефікацыі помнікаў драўлянага дойлідства*

Праблемы музеефікацыі і захавання помнікаў драўлянага дойлідства. Вызначэнне помніка як носьбіта будаўнічай традыцыі. Музеефікацыя добра захаваных і рэканструяваных элементаў гістарычнага асяроддзя. Унікальныя помнікі драўлянага дойлідства. Метады захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Рэстаўрацыя і кансервацыя аб'ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. Фрагментарная рэканструкцыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 15 Праблемы музеефікацыі археалагічных аб'ектаў*

Тэарэтычныя даследаванні па пытаннях музеефікацыі археалагічных аб'ектаў. Праблемы кансервацыі, захавання і паказу пад адкрытым небам ці ў павільёнах археалагічных аб'ектаў. Музей археалогіі "in situ".

Праблемы захавання і экспанавання асобных археалагічных прадметаў і калекцый. Супярэчнасць паміж галоўным прынцыпам музейнага захавання і прынцыпам непадзельнасці археалагічных калекцый. Асаблівасці каталагізацыі археалагічных прадметаў. Археалагічная экспазіцыя. Экспазіцыйная і фондавая работа айчынных і замежных музеяў археалогіі.

Камп'ютарная археалагічная праграма. Трохмерная рэканструкцыя архітэктурных і скульптурных скарбаў Парфенона. Сайты па археалогіі ("Скіфіка – Кельтыка" ,"Партал археалогіі Расіі", "”Сервер усходнееўрапейскай археалогіі"). Д. Кепін "Музейны этнаархеалагічны тэатр".

*Тэма 16 Феномен музея гарадскога асяроддзя*

Спецыфіка музея гарадскога асяроддзя. Урбаскансэны як аснова для разгляду іх у якасці самастойнай з'явы. Сумяшчэнне рыс музеяў-запаведнікаў розных профіляў (гтсторыка-архітэктурнага, этнаграфічнага, археалагічнага і інш.). Шляхі стварэння музея гарадскога асяроддзя і іх фактары. Стан навуковай распрацоўкі праблематыкі, асаблівасці нацыянальнай культуры і інш. Комплекснае вывучэнне феномена музея гарадскога асяроддзя ў спектры культуралагічных праблем.

Прымяненне аксіялагічнага метаду для вызначэння ўнікальнасці, архітэктурна-мастацкай і гісторыка-культурнай каштоўнасці гарадскіх помнікаў і забудоў.

Наяўнасць і структуры музея гарадскога асяроддзя трох кампанентаў: комплексаў архітэктурных помнікаў і зон аховы, калекцыі аўтэнтычных гісторыка-побытавых прадметаў і дакументальных матэрыялаў. Аналіз стварэння музеяў гарадскога асяроддзя ў Італіі (Ферера), Албаніі (Гіракастра

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і Берат), Даніі (Орхус), Балгарыі (Несебр), Вялікабрытаніі (Гарадскі сектар музея пад адкрытым небам у Бімішы), Украіне (Кіеў, Львоў), у Прыбалтыцы. Перспектывы стварэння музея гарадскога асяроддзя ў г. Мінску.

*Тэма 17 Рэгіянальныя музеі ў культурнай прасторы ва ўмовах глабалізацыі*

Рэгіянальная спадчына: вопыт вывучэння і музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны Расіі і краінаў Еўропы. Значэнне краязнаўчых рэгіянальных музеяў у захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Экспазіцыйная дзейнасць як інтэрпрэтатар рэгіянальнай гісторыі музейнымі сродкамі. Механізм узаемадзеяння музея і грамадства, яго роля ў развіцці рэгіёна. Эвалюцыя рэгіянальных музеяў Беларусі ў канцы XX – пач. XXI ст.

Рэгіянальныя музеі як транлятары гісторыка-культурнай спадчыны беларукага народа. Вывучэнне і выкарыстанне гісторыка-культурнай і прыродна-ландшафтнай спадчыны рэгёнаў Беларусі. Праблемы музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны рэгёнаў Беларусі. Перспектывы развіцця рэгіянальных музеяў у культурнай прасторы ва ўмовах глабалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

(дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| | Уводзіны | 1 | | | |
| 1. | Тэарэтычныя праблемы музеялогіі ў канцы XIX- першай палове XX ст. | 1 | 1 | 2 | Выбарачнае апытанне, пісьмовая работа |
| 2. | Тэарэтычнае асэнсаванне праблем музеязнаўства ў другой палове XX – пачатку XXI ст | 2 | 1 | | Дыскусія |
| 3. | Навуковыя даследаванні па праблемах міжкультурных камунікацый | 1 | | 2 | Выбарачнае апытанне |
| 4. | Інтэграцыя музея. Тэорыя музейнай камунікацыі | 1 | 1 | | Выбарачнае апытанне |
| 5. | Новыя тэндэнцыі ў развіцці музеяў у другой палове XX-пачатку XXI ст. | | 2 | | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка рэфератаў |
| 6. | Музей як культурная форма | 1 | | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| 7. | Асноўныя тэндэнцыі фарміравання экспазіцый мастацкіх музеяў XX – пачатку XXI ст | 1 | 2 | | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 8. | Асноўныя тэндэнцыі ў сучаснай музейнай архітэктуры і яе ўплыў на структуру музейнай экспазіцыі | 1 | 1 | | Падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| 9. | Інфармацыйнае забеспячэнне музейнай экспазіцыі на сучасным этапе | 1 | 1 | | Выбарачнае апытанне |
| 10. | Канцэпцыя сучаснай культурна-адукацыйнай дзейнасці музея | 1 | 1 | | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне |
| 11. | Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў на сучасным этапе | 1 | 1 | | Выбарачнае апытанне |
| 12. | Асноўныя праблемы тыпалогіі музеяў і іх характарыстыка | 2 | 1 | 2 | Падрыхтоўка паведамленняў |
| 13. | Тэарэтычныя аспекты вывучэння музеяў-запаведнікаў | 1 | | | Падрыхтоўка рэфератаў |
| 14. | Праблемы музеефікацыі помнікаў драўлянага дойлідства | 1 | | 1 | Выбарачнае апытанне |
| 15. | Праблемы музеефікацыі археалагічных аб’ектаў | 1 | | 1 | Выбарачнае апытанне |
| 16. | Феномен музея гарадскога асяроддзя | 1 | 2 | | Падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| 17. | Рэгіянальныя музеі ў культурнай прасторы ва ўмовах глабалізацыі | 2 | 2 | | Дыскусія |
| | **Разам:** | **20** | **16** | **10** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### (завочная форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | |
| 1. | Уводзіны.<br>Тэарэтычныя праблемы музеялогіі ў канцы XIX-першай палове XX ст.<br>Тэарэтычнае асэнсаванне праблем музеязнаўства ў другой палове XX –пачатку XXI ст.<br>Навуковыя даследаванні па праблемах міжкультурных камунікацый | 2 | | Выбарачнае апытанне, пісьмовая работа, дыскусія |
| 2. | Інтэграцыя музея. Тэорыя музейнай камунікацыі<br>Новыя тэндэнцыі ў развіцці музеяў<br>у другой палове XX-пачатку XXI ст.<br>Музей як культурная форма | 1 | 1 | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка рэфератаў, тэставае заданне |
| 3. | Асноўныя тэндэнцыі фарміравання экспазіцый мастацкіх музеяў XX – пачатку XXI ст.<br>Асноўныя тэндэнцыі ў сучаснай музейнай архітэктуры і яе ўплыў на структуру музейнай экспазіцыі.<br>Інфармацыйнае забеспячэнне | 1 | 1 | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | музейнай экспазіцыі на сучасным этапе | | | |
| 4. | Канцэпцыя сучаснай культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.<br>Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў на сучасным этапе.<br>Асноўныя праблемы тыпалогіі музеяў і іх характарыстыка | | 2 | Выбарачнае апытанне, тэставае заданне, падрыхтоўка паведамленняў |
| 5. | Тэарэтычныя аспекты вывучэння музеяў-запаведнікаў.<br>Праблемы музеефікацыі помнікаў драўлянага дойлідства.<br>Праблемы музеефікацыі археалагічных аб’ектаў | 1 | 1 | Падрыхтоўка рэфератаў, выбарачнае апытанне |
| 6. | Феномен музея гарадскога асяроддзя.<br>Рэгіянальныя музеі ў культурнай прасторы ва ўмовах глабалізацыі | 1 | 1 | Падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый, дыскусія |
| | **Разам:** | **6** | **6** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
### Літаратура
*Асноўная*


1.*Калугина, Т П.* Художественный музей как феномен культуры / Т.П. Калугина. – СПб., 2008. – 415 с.

2.*Калбаска, А.М.* Музейны Дыярыуш, ці Уводзіны ў новую музеялогію / А.М. Калбаска. – Мінск: БелІПК, 1999. – 148 с.

3.*Канцэпцыя* развіцця музейнай справы Рэспублікі Беларусь: навуковае выданне Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь / Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры. – Мінск: БелДІПК, 2004. – 31 с.

4.*Кликс, Р.Р.* Художественное проектирование экспозиций / Р.Р. Кликс. – М., 2008. – 435 с.

5.*Кодэкс* Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронный ресурс] : 20 июля 2016 г., № 413-З : принят Палатой представителей 24 июня 2016 г. : одобр. Советом Респ. 30 июня 2016 г. // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: http://www.pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413&p1=1. – Дата доступа: 10.11.2018.

6. *Лакотка, А.І.* Беларусы: у 8 т. – Т. 2: Дойлідства / А.І. Лакотка. – Мінск: Тэхналогія, 1997. – С. 38-51; 234-292; 315-370.

7.*Музеі* Беларусі: Праблемы. Перспектывы. Инавацыі: Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць / агул. рэд. І. Б. Лапцёнак. – Мінск: ДУА "Інстытут культуры Беларусі", 2012. – 231 с.

8. *Несцярчук, Л.М.* Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі / Л.М. Несцярчук. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 283 с.

9. *Поляков, Т.П.* Мифология музейного проектирования или «Как делать музей?» / Т.П. Поляков. – М., 2003. – 210 с.

10.*Шумейко М.Ф.* Собрать рассеянное: о реституции белорусских архивов в прошлом и настоящем / М.Ф. Шумейко. – Минск, 1997. – 123 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

*1.Гнедовский, М.Б.* Принципы классификации музеев /М.Б. Гнедовский, О.В.Хлопина // Музееведение. Вопросы теории и методики: сб.науч.тр./ НИИ культуры. – М., 1987. – С.25-54.

*2.Гнедовский, М.Б.* Проектирование прошлого и музей будущего: метаморфозы проектного подхода в музейном деле / М. Б. Гнедовский // От за мысла к реализации : сб. науч. тр. / НИИ культуры. – М., 1998. – С. 68-79.

*3.Гужалоўскі А.А.* Гісторыя музейнай справы Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік /А.А. Гужалоўскі – Мінск: БДУ, 2012 г. / – 304 с.

*4.Дукельский, В.Ю.* Памятники истории и культуры в системе музейной деятельности / В.Ю. Дукельский // Памятниковедение: теория, методология, практика: сб.науч.тр. / НИИ культуры. – М., 1986. – С.89-107.

*5.Зиновьева, Ю.В*. Взаимодействие музея и общества как социокультурная проблема: автореф.дис. … канд. культурологии / Ю.В.Зиновьева. – СПБ.,2000. – 19 с.

*6.Зыков, А.В*. Музееведческая концепция Н.Ф. Фёдорова и современное музееведение: монография / А.В.Зыков. – Кемер.ист.-архитектур. музей-заповедник “Красная Горка”. – Кемерово: Крас. Горка, 2002. –146 с.

*7. Литвинов, В. В:* Практика современной экспозиции. — М.: RUdesign, 2005.-319 с.

*8. Локотко, А.И.* Архитектурное наследие Беларуси. Развитие традиций, охрана и реставрация / А.И. Локотко. – Минск: Право и экономика, 2004. – 303 с.

9. *Музееведение.* Музеи исторического профиля: учеб. пособие для вузов па специальности «история» / под ред. К. Г. Левыкина, В. Хербста. – М.: Высш. шк., 1988. – С. 195 – 269.

*10.Мартыненко, И.Э.* Правовая охрана историко-культурного наследия: учеб. Пособие для студентов гуманит. спец.учрежд.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

обеспечивающих получение высш. обр. / И.Э. Мартыненко. – Гродно: Гродн. гос. ун-т, 2005. – 251 с.

*11.Международная* хартия по охране исторических городов (Вашингтон, 1987) // Каштоўнасці мінуўшчыны-2. – Мінск ,1999. – С. 149-152.

*12. Нароўская*, А.М. Асноўныя тэндэнцыі фарміравання экспазіцыйнага дызайну ў мастацкіх музеях XX – пачатку XXI стст. / Нароўская А.М // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2014. – № 2 (22). – С. 129 –139.

*13.Помнікі* этнаграфіі. Методыка выяўлення, апісання і збірання. – Мінск, 1981. – С. 95 – 110; С. 116 – 120.

*14.Основы* музееведения: учеб. пособие / отв. ред. Э. А. Шулепова. – М.: ЕдиториалУРСС, 2005. – С. 13–107, 196–202, 257–323.

*15.Шляхтина, Л.М.* Основы музейного дела: теория и практика: учеб. пособие / Л. М. Шляхтина. – М.: Высш. шк., 2005. – С. 5–67.

*16.Шола, Т.* Предмет и особенности музеелогии / Т. Шола // Museum. – 1987. – № 153. – С. 49–53.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Актуальныя пытанні музейнай справы» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання: лекцыйныя і семінарскія заняткі, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя метады (групавыя дыскусіі, мадэліраванне практычных сітуацый і інш.), візуальныя метады (метады ілюстрацыі, дэманстрацыі, відэаматэрыял).

У лік эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы магістрантаў

Арганізацыя самастойнай работы магістрантаў прадугледжвае падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падразделах вучэбнай дысцыпліны, вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўку да экзамена і інш.

Самастойная работа магістрантаў накіравана на:

- фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;
- засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;
- развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення экзамена.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці магістрантаў

Арганізацыя вучэбнай работы магістрантаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук, анліз і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне.

Для дыягностыкі атрыманых магістрантаў ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– тэставыя заданні па асобных падраздзелах і дысцыпліне ўцэлым;

– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– выступленні на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне экзамена.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці**

| Балы | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адсутнасць ведаў і кампетэнтнасці ў межах дысцыпліны; адмова ад адказу. |
| 2 (два) | Фрагментарныя веды ў рамках дысцыпліны; веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай дысцыпліны; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых памылак; пасіўнасць на практычных занятках, нізкі ўзровень культуры ў выкананні і афармленні заданняў. |
| 3 (тры) | Недастатковa поўны аб'ём ведаў у рамках дысцыпліны; веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выкладанне адказу на пытанні з істотнымі памылкамі; слабае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; няўменне арыентавацца ў сутнасці асноўных тэорый, канцэпцый і кірункаў вывучаемай дысцыпліны; пасіўнасць на практычных занятках, нізкі ўзровень культуры ў выкананні і афармленні заданняў. |
| 4 (чатыры) | Мінімальна дастатковы аб'ём ведаў у рамках дысцыпліны; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне выкарыстоўваць яго ў вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім ацэнку; работа пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 5 (пяць) | Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных задач; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім параўнальную ацэнку; самастойная работа на практычных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 6 (шэсць) | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных задач; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім параўнальную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастаткова высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 7 (сем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 8 (восем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай дысцыпліны; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 9 (дзевяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; дакладнае выкарыстанне навуковай |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная сістэматычная самастойная работа на практычных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 10 (дзесяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, а таксама па асноўных пытаннях па-за яе межамі; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне эфектыўна яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай праграмы; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін; самастойная творчая работа на практычных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ